**Вера Пракапцова**

# ЕЛЬСКІЯ З ДУДЗІЧАЎ - ВЯДОМЫЯ ПРАДСТАЎНІКІМАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ XIX СТ.

У гісторыі беларускай мастацкай культуры вядомы некалькі чалавек з прозвішчам Ельскі. Усе яны ў сваім жыцці спрычыніліся да розных відаў дзейнасці, але гэтая дзейнасць ядналася адной галіной - культура Беларусі. Вядомыя скульптары Караль, Ян і Казімір Ельскія; гісторык, этнограф, публіцыст Аляксандр Ельскі; скрыпач і кампазітар Міхаіл Ельскі.

Самым старэйшым па ўзросту быў Караль Ельскі (памёр у 1824 г.). Яшчэ ў 1778-1782 гг. ён працаваў як лепшчык разам з італьянскім архітэктарам К.Спампані, які ў 1770-я - пачатку 1780-х гадоў працаваў на Беларусі і Літве - у Шчорсах, Заслаўі, Нясвіжы, Вільні. Караль Ельскі аздобіў лепкай палац у Заслаўі, дэкарыраваў інтэр'еры іншых палацаў і сядзіб. У 1783 г. стварыў партрэтны медальён і надмагілле К.Спампані ў базыльянскай царкве ў вёсцы Чапцы, што каля Нясвіжа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Караль Ельскі выхаваў і вывучыў прафесіі скульптара двух сыноў - Яна і Казіміра. Ян (нарадзіўся ў 1780 г.) выконваў заказы буйных мангатаў, напрыклад, Даменіка Радзівіла, і для Нясвіжскага замка вырабіў дзесяць разьбяных рам партрэтаў. Казімір Ельскі (1782-1867) стаў самым буйным скульптарам у гэтай сям'і. Ён баў першым прафесарам скульптуры ў Беларусі.

Вільнюс - галоўны горад Паўночна-Заходняга краю - стаў тым цэнтрам, дзе найбольш поўна раскрыўся талент скульптараў Ельскіх. Караль у 1791-1792 гг. стварыў скульптуры св.Алены, Казіміра і Станіслава для Віленскага кафедральнага сабора. Ян у 1804 г. выканаў фігуры пракрокаў Іераміі і Ісаі для галоўнага алтара касцёла Пятра і Паўла ў Вільні. Казімір пасля вучобы ў 1804-1808 гг. у Віленскім універсітэце на кафедры скульптуры і ўдасканальвання скульптурнага майстэрства ў Пецярбургу атрымаў ступень кандыдата мастацтваў, а ў 1810 г. - ступень магістра мастацтваў.

Казімір Ельскі пасля смерці Ле Бруна ўзначаліў кафедру скульптуры ў Віленскім універсітэце. Сярод яго вучняў - Ян Астроўскі (1811-1872), Казімір Кавалеўскі (1798-?), Рафал Слізень (1804-1881), Канут Русецкі (1801-1860).

У свёй практычнай дзейнасці К.Ельскі шмат увагі надаваў ідэі сінтэзу мастацтваў, што знайшло адлюстраванне і ў яго мастацтвазнаўчым трактаце «Аб сувязі архітэктуры, скульптуры і жывапісу» (1822). У сваёй уласнай творчасці і ў сістэме мастацкай адукацыі ён прытрымліваўся асветніцкіх пазіцый эпохі класіцызму.

Казімір Ельскі прымаў удзел у грамадска-палітычным руху, з'яўляўся членам тайнага таварыства філаматаў і філарэтаў, дзейнасць якога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была накіравана супраць царскага самадзяржаўя. Менавіта ўдзел К.Ельскага і яго вучняў у дзейнасці таварыства філаматаў і філарэтаў сталі адной з прычын таго, што ў 1826 г. быў закрыты скульптурны клас.

Творчасць Казіміра Ельскага раскрываецца ў разнастайных жанрах: скульптурны партрэт, барэльефы, скульптура малых формаў, сакральная і мемарыяльная пластыка. Ім створаны партрэты вядомых дзеячоў культуры і навукі - Францішка Пелікана, Эрнеста Готфрыда Градзецкага, Андрэ Ле Бруна, Міхала Пачобута, Адама Бялькевіча, Яна Снядэцкага, Францішка Смуглевіча, Яна Рустэма, Іосіфа Франка, Іаахіма Храптовіча, Міхала і Антонія Ромерах, Кароля Ліпінскага, Юльяна Нямцэвіча і інш.

Братоў Аляксандра (1834-1916) і Міхала (1831-1904) Ельскіх шмат у чым аб'ядноўвала музычнае мастацтва. Хаця Аляксандр быў пісьменнікам, гісторыкам, этнографам, перакладчыкам, публіцыстам, тым не менш ён цікавіўся музыкай, у асноўным з пункту гледжання калекцыяніравання музычных інструментаў, нотаў, рукапісаў з аўтографамі знакамітых кампазітараў і выканаўцаў. Яму належала віяланчэль вядомага майстра Альбані, і Аляксандр Ельскі лічыўся сярод музыкантаў-аматараў добрым віяланчэлістам і нават спрабаваў свае сілы ў кампазіцыі. Сярод яго любіцельскіх кампазіцый даследчыкі вызначаюць «Мазурку» і «Звон-польку» для фартэпіяна.

У краязнаўчым музеі ў Замосці, які Аляксандр Ельскі заснаваў у 1864 г., мелася вялікая колькасць твораў мастацтва - карціны, гравюры, малюнкі і эскізы заходнееўрапейскіх і мясцовых мастакоў, асобныя прадметы і лісты А.Міцкевіча, А.Т.Касцюшкі, калекцыі фарфору, шкла, слуцкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паясоў і г.д. Аляксандр Ельскі - першы біёграф В.Дуніна-Марцінкевіча.

Міхал Ельскі застаўся ў гісторыі як выдатны беларускі скрыпач, кампазітар, музычны публіцыст. Ён вучыўся ў вядомага мінскага скрыпача кампазітара і педагога Канстанціна Крыжаноўскага В.Банькевіча ў Вільні, удасканальваў сваё выканальніцкае майстэрства ў А.Вьётана ў Парыжы, К.Ліпінскага ў Дрэздэне. У другой палове XIX ст. гастраляваў у Польшчы і Германіі. Доўгі час жыў у сваім маёнтку ў Дудзічах, адкуль выязджаў з канцэртамі ў Мінск і Вільню. У яго канцэртным рэпертуары былі творы Дж.Б.Віёці, Вьётана, К.іпінскага, Л.Шпора. Рэцэнзенты ў скрыпічным выкананні М.Ельскага вызначалі тэхнічную лёгкасць і чыстату выканання.

Міхал Ельскі быў кампазітарам эпохі рамантызму. Таму сярод яго твораў шмат музыкі танцавальнага і песеннага жанру, што было вельмі характэрна для гэтага часу - паланезы, мазуркі, танцы фантастычных вобразаў («Танец смерці», «Танец духаў»), Песні без слоў. У рэчышчы стылістыкі рамантызму з'явіліся і яго інструментальныя канцэрты, санаты-фантазіі, фартэпіянныя і скрыпічныя мініяцюры. Выразныя сродкі музычных твораў, якія выкарыстоўваў М.Ельскі ў сваіх сачыненнях, адпавядалі выразнасці еўрапейскага рамантызму: ён ужываў разнастайныя віды пасажнай тэхнікі, падвойныя ноты, арпеджыо, нацыянальны мелас.

Музычная публіцыстыка М.Ельскага адлюстроўвала тагачаснае музычнае жыццё. Ён друкаваў артыкулы аб творчасці кампазітараў і музыкантаў-выканаўцаў: Ю.Дашчынскага, К.Крыжаноўскага, К.Стравінскага і інш. Яму належыць праца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Народныя танцы Мінскай губерні», у якой сабраны яго экспедыцыйныя запісы народных мелодый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ